# Хранители письменности

***Калектыву супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі***

Дарагія сябры!

Шчыра віншую вас і ўсіх чытачоў з 80-годдзем з дня заснавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Гэты юбілей — знамянальная падзея ў культурным жыцці рэспублікі. Ваша бібліятэка — светлы храм ведаў, сімвал мудрасці і духоўнасці беларускага народа. На працягу свайго існавання яна з гонарам выконвала высокую місію захавальніцы гістарычнай памяці і велізарных інтэлектуальных багаццяў, якія створаны чалавецтвам.

Сёння Нацыянальная бібліятэка — буйнейшы інфармацыйны і культурны цэнтр Беларусі. Далейшае ўдасканаленне яе дзейнасці на аснове шырокага выкарыстання сучасных тэхналогій з'яўляецца адной з неабходных умоў развіцця адукацыі, навукі і вытворчасці. Таму ўзвядзенне новага будынка галоўнай бібліятэкі краіны на ўзроўні сусветных стандартаў — справай агульнадзяржаўная і агульнанародная справа, наш святы і пачэсны абавязак перад будучыняй і нашчадкамі.

Упэўнены, што ваш калектыў і надалей будзе працаваць творча і плённа дзеля духоўнага росквіту Радзімы.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і аптымізму.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

* * *